**“Трыялет” (“Як птушка ў гібкіх трасніках...”)**, верш Б. Датуецца 1912. Традыцыйныя для гэтага віду васьмірадковага верша выкарыстанне 4-стопнага ямба, чаргаванне мужчынскай і жаночай рыфмаў па схеме ABbA baAB. Эпіграфам Б. узяў словы “Красавец юный, Триолет” з твора рускага паэта К. Фофанава, які разам з К. Бальмонтам, В. Брусавым, І. Севяраніным пасля доўгага забыцця ў другой палове XIX ст. вярнуў гэты від верша ў рускую паэзію. Выраз К. Фофанава паслужыў і эпіграфам да твора Б. “На солнце загляделся я...”, аўтарскага перакладу трыялета “Калісь глядзеў на сонца я...”, уключанага ў рукапісны зборнік “Зеленя”. Ацэначным эпіграфам Б. засведчыў прыхільнасць да гэтай вершаванай формы, выказаў захапленне яе арыгінальнасцю і вытанчанасцю – трыялет паўстае сімвалам высокага паэтычнага майстэрства. Верш прысвечаны тэме мастака і мастацтва, адной з магістральных у шматграннай творчай спадчыне паэта. У ім выяўляюцца рысы, характэрныя для паэзіі французскіх сімвалістаў (намёкі, недагаворанасць, загадкавасць), якая аказала вялікі ўплыў на фарміраванне Б. як мастака. Верш уяўляе сабою імпрэсіяністычную замалёўку, створаную ў пазнавальнай манеры паэта “чыстай красы”: гэта спроба занатаваць нябачныя зрухі душы, аднамомантныя азарэнні розуму, зменлівыя ўражанні. У выніку такога няўлоўнага, амаль таямнічага судакранання разумовага і эмацыйнага, думкі і пачуцця і нараджаецца верш. Мовай сімвалаў і метафар Б. раскрывае таямніцу з’яўлення твора: паэтычнае натхненне настолькі няўлоўнае і непрадказальнае, як раптоўныя перамяшчэнні птушкі, што хаваецца ў зарасніках трыснягу.

Упершыню – зб. Вянок, с. 94.

*Н.В. Заяц*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ